Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

3 ЛЮТАГА 2010 г. СЕРАДА № 4 (15608)

Журналіст мяняе прафесію

# КАНДЫДАТЫ Ў МАДЭЛІ

## Частка чацвёртая. «Скраб з абрыкосавымі костачкамі адсуньце падалей, а лепш падарыце сяброўцы»

*(Працяг. Пачатак у №№ «ЧЗ» 1—3.)*

**КАБ разабрацца ў тонкасцях мадэльнага бізнэсу, наш спецкар Ілья ЛАПАТО пад выглядам патэнцыйнай мадэлі паступіў у адну з вядучых мадэльных школ сталіцы. Занатоўваючы свае назіранні, тры шматпакутныя месяцы ён спасцігаў мастацтва дэфіле, асновы касметыкі і фотатрэнінгу.**

### ПЕРШЫЯ ПАДСУМАВАННІ І НОВЫЯ ЎРАЖАННІ

— Ой, гэтыя паказы так стамляюць... Дзясяткі калекцый, а з публікі — гламур і алігархі. Толькі шопінг парадаваў. Гэта табе не «Жданы» — Маскоўскі тыдзень моды як-ніяк...

Стаўшы ў канцы залы, каб ніхто не чуў, навіны моды абмяркоўвалі... два хлопцы. Каб чуць лепш, я падышоў бліжэй. Але хлопцы трымалі раўнавагу і мяне ва ўпор не заўважалі. Уключыўшы «дурачка», смехам-жартам далучыўся да размовы. Аднаго хлапца звалі Саша і на курсы ён ходзіць другі сезон (значыць, чацвёрты месяц). Другі хлапец — Коля. Агенцтва Максіма з ім даўно заключыла кантракт, таму сёння Коля раз'язджае па Маскоўскіх тыднях моды і экзаменам напрыканцы курсаў, у адрозненне ад нас, не абцяжараны. Ён прыходзіць на аэробіку проста так — каб форму падтрымліваць.

Жылістая інструктар Святлана, як заўсёды, была пунктуальная і верная сваім традыцыям: белыя красоўкі і магнітафон у руках. Пад ужо прывычнае «тры-чатыры» мы паўтаралі практыкаванні, якія засвоілі на працягу апошняга месяца. Наклоны, прыстаўныя крокі, бег на лыжах... Фантазія ў Святланы была багатай, і гэта ўсім падабалася — ніякіх лішніх кілаграмаў. Стэп, лясэ, прэс...



Нас ужо не дзялілі на хлапцоў і дзяўчат, гэта быў ужо нейкі «трэці пол», з якога ляпілі дэманстратараў адзення. Ніхто не звяртаў увагу на набедраныя павязкі дзяўчат, якія шчыра верылі, што прыйшлі ў шортах. Ніхто не крычаў больш на хлопцаў, якія апраналі шорты ніжэй за калена (а гэта было супраць правілаў). Нават на «пясочніцу» больш не прыкрыквалі, хаця іх ужо даўно ніхто не заўважаў. Усё роўна яны скакалі неўпапад і не пападалі ні ў адзін з рухаў — адзінкі з малых трымалі рытм.

Час ад часу на заняткі прыходзіў Максім. Ён станавіўся ззаду нас, абапіраўся на сценку і назіраў. У такія хвіліны кожны выкладваўся на ўсе сто, краем вока прыкмячаючы, ці зірнуў Максім на яго (яе) хоць раз.

За той месяц, які мы займаліся аэробікай, пра наша самаадчуванне спыталі толькі аднойчы. Гэта ўлічваючы, што практычна на кожным занятку дадаваліся новыя нагрузкі. Напрыканцы месяца Света пацікавілася: «Ці ёсць у нас людзі са спецгрупы? Калі так, то нагрузку на прэс можаце не рабіць». У мяне пасля аэробікі заўсёды шалёна скакаў ціск. Але я не падаваў выгляду, як і многія з маёй групы. Кожны даўно зразумеў: калі ты чымсьці горшы за астатніх, шанцы трапіць у агенцтва ў цябе рэзка скарачаюцца.

— Як ты робіш? Гнуцца трэба да канца — паглядзі, як раблю я, — «дапамагчы» мне вырашыў Коля. — Згінай рукі ў локцях і прагні спіну так, каб таз хіліўся назад!

Упершыню я бачыў чалавека, які падпарадкоўваўся сістэме цалкам. Калі ён адстаўляў нагу, то рабіў гэта грацыёзна, як лань на выгуле. Шыю паварочваў плаўна, як лебедзь. А выразам твару даказваў непахісную вернасць інструктару. Адзіная засада была ў тым, што большасць яго рухаў пасавала дзяўчатам, але ніяк не хлопцам. Калі рабіць усё на манер дзяўчат, то табе хутка прыклеяць эпітэт «манерны». Коля пра гэта, відаць, не ведаў.

### HOME DUMAS — ЧАЛАВЕК, ЯКІ ДУМАЕ

Пра тое, што аэробіку можна філоніць, я спачатку не здагадваўся. Але працэнтаў 70 нашай мужчынскай групы аказаліся куды больш дасведчанымі — яны наведвалі толькі дэфіле, апускаючы ўсё астатняе. У нечым гэта было значна прасцей — ніякіх табе клопатаў пра шкарпэткі, шорты і палавічкі.

Таму калі мы, змораныя аэробікай, прыходзілі на дэфіле, там нас ужо чакала купка хлапцоў у джынсах, якія глядзелі на нас, як на касту шудраў.

Неўзабаве з'яўляліся і брахманы: Максім і яго памагатая. Толькі ўжо не Зоя, а іншая — Кіра. Кіра была высокая, як палка, і худая, як шчэпка. Касметыкі на яе твары было больш, чым на ўсіх нас, разам сабраных. Скруціўшы ў гульку касмыль перапаленых фарбай валасоў і насупіўшы бровы, Кіра пачала:

— У мінулы раз праходзілі «лянівы прыпынак». Спадзяюся, дома паўтарылі і мне не прыйдзецца сёння па дзесяць разоў зноў паказваць. Стартуем!

Мы рабілі крокі, час ад часу збіваючыся і не трапляючы ў лік. Кіру гэта страшэнна злавала. Максім сядзеў збоку і моўчкі назіраў за нашымі пакутамі.

— Так, я вам не Зоя! Цацкацца не стану! Хутка ўсталі! Малая, выйдзі з кустоў — і не грызі пазногці! — з кожнай хвілінай мы «падабаліся» Кіры ўсё больш. А яна нам — усе менш.

Зноў праход і зноў крык. Тут не вытрымаў ужо Максім. Вывеўшы са строю даўганогую дзяўчыну на чырвоных абцасах, ён загадаў прайсціся ёй сола перад усёй групай. Мы, уцягнуўшы жываты і выпрастаўшы спіны, ледзьве дыхалі, але голасу не падавалі.

— Ну, што ты ходзіш, як растапырка? На дыскатэцы, ці што? Прыгажунька, блін... Як прыйшла, дык вучыся. Ці думаеш, што мы цябе за прыгожыя вочкі возьмем?!

Хтосьці пазіраў на дзяўчыну з жаласцю, хтосьці спачуваў, а ў кагосьці на твары свяцілася радасць — асэнсаванне сябе лепшай, чым «растапырка», выклікала сапраўдную эйфарыю ў дзяўчат.

Бедная дзяўчына, зачырванеўшыся, трывала, ледзьве стрымліваючы слёзы. Адолеўшы ганебны праход, яна стала ў строй і ўсё пачалося па новай...

Напрыканцы Кіра зрабіла аб'яву: «Наступны раз прыходзім у халатах з поясам і гузікамі. Для хлопцаў падыдуць пінжакі, будзем вучыцца паказваць верхняе адзенне».

Стомленыя, пад пільным позіркам Максіма, мы папляліся пераапранацца. Наперадзе чакала лекцыя.

### СТЫЛЬ «МІЛІТАРЫ» — ІСПАНСКІЯ НАЁМНІКІ

Мужчынская распранальня выглядае звычайна аднолькава: цесна і душна. Да таго ж, як толькі пачнеш пераапранацца, дзверы адчыняцца і з выглядам курыцы-квахтухі свой нос усуне чыя-небудзь «мамаша».

З каменным тварам, не заўважаючы нікога, акрамя свайго 6-гадовага Ігарка яна падыходзіць да сына і, дапамагаючы яму апранацца, распытвае, што мы сёння рабілі. Малое пачынае прыдумляць, як яму было цікава і як адну дзяўчынку сёння «прымусілі хадзіць адну і як смешна яна хадзіла, нібы бусліха».

Але гэтым разам у час, калі большасць хлопцаў стаяла ў адным споднім, у распранальню зайшоў... Максім. Акінуўшы нас з ног да галавы пільным позіркам, мужчына выдаў: «Ты, ты і ты. Рост?»

Ад нечаканасці, што тыкнулі на мяне, адразу свой рост я нават не ўзгадаў.

«Так, значыць, вы трое, трэба, каб сазваніліся з Вадзімам, нашым стылістам і пастрыгліся так, як ён скажа. Мне патрэбен стыль «іспанскіх наёмнікаў». Будзем глядзець, можа які толк з вас і будзе. Косця, маеш тэлефон?»

Хлопец Косця кіўнуў і ўхмыльнуўшыся, глянуў на нас.

Выходзячы, Максім паказаў на мяне і трэцяга хлопца: «А вы, каб знялі акуляры. Адвыкайце, бо па подыуме ў акулярах не ходзяць. Прыдумайце што-небудзь».

Другога акулярыка звалі Дзіма. Мы былі з ім прыблізна аднаго росту і адной камплекцыі. Дзіма вучыўся ў медыцынскім.

### БІТВА ЗА ПРЫГАЖОСЦЬ

На лекцыі па касметалогіі Дзіма прапанаваў сесці разам, як ніяк, а з ім з гэтага часу мы былі ў адной лодцы. Трэці, «выбраны Максімам», на лекцыі не хадзіў. Яго, як і некаторых іншых хлапцоў, Максім сам запрасіў на курсы, таму хлопец, адпаведна да іх і ставіўся.

— Падыміце руку, хто сёння пасля дэфіле памыў рукі? — касметолаг Таццяна правярала нашую памяць. — Малайцы! А магу я цяпер убачыць, што за напіткі вы прынеслі з сабою?

Усе паднялі мінералку без газаў. Адразу было бачна, хто на мінулай лекцыі не быў — некаторыя прыйшлі з колай і фантай.

Таццяна ўсміхнулася і лекцыю пачала чамусьці з пералічэння тэлефонаў касметычных лячэбніцаў. Пасля пачала тлумачыць тэхналогію лёгкага лімфадрэнажу — для барацьбы з лёгкімі маршчынамі. Адна з дзяўчынак хуценька спяшалася ўсё запісаць.

— Дзеці, а вас бацькі дома не чакаюць? — спытала Таня ў «пясочніцы».

— Не, мама ў машыне чакае, — быў адказ.

За час лекцыі мы даведаліся, чаму далоні пахнуць кварцам і як правільна даглядаць скуру.

— З раніцы — касметычнае малачко, затым тонік (для тлустай скуры — тонік на шалфеі, календуле альбо крапіве). Дадайце ў яго некалькі кропель лімоннага соку альбо шасціпрацэнтны яблычны воцат, — раіла Таня. — Далей вазьміце сродак па догляду за вейкамі і дзённы крэм для твару. Скраб з абрыкосавымі костачкамі адсуньце падалей, гэта брыдота, падарыце яго лепш сяброўцы.

Нягледзячы на жарт, дзяўчынкі не смяяліся, быццам даўно так і зрабілі.

— Дадатковы догляд выхаднога дня: пілінг і маска.

— А што такое пілінг?

Я ўжо падумаў, што спытаў нешта страшнае, мяркуючы па колькасці дзяўчат, якія на мяне азірнуліся...

— Пілінг — глыбокае ачышчэнне скуры, сорамна пра гэта не ведаць — і зноў завяла пласцінку пра будову скуры і базальную мембрану.

Далей мы пераключыліся на тэму харчавання — Таня адкрыла страшную праўду пра эстрагены, калі мужчына ператвараецца ў жанчынападобнага хлопца з атлусценнем па жаночаму тыпу...

Скончылася лекцыя цікавай прапановай зрабіць аналіз на яйкаглісты: «І запомніце, мае даражэнькія, — выводзіла ісціну Таня. — Калі вам увесь час хочацца есці, значыць, вас там двое: зрабіце аналіз кала на яйкаглісты!..»

**Ад аўтара.** *Мае думкі ў той вечар цяжка было сабраць у адно цэлае. З галавы не выходзілі словы Максіма пра стыль «іспанскіх наёмнікаў» і інструкцыя Тані па лімфадрэнажу. Адчувалася нейкая перамена. І чамусьці ўжо было зразумела, наступны занятак будзе не такі, як заўсёды. Зрэшты, адчуванне мяне і сапраўды не падвяло.*

Ёсць пытанне!

# ГРОШЫ ЁСЦЬ, АЛЕ ІХ НЕ БАЧНА

## Плюсы і мінусы карыстання банкаўскімі карткамі

**МІНУЛІ тыя часы, калі для атрымання стыпендыі ў бухгалтэрыю з вялізнай сумкай засылаўся староста групы. Менавіта ён пад подпіс выдаваў пасля грошы аднагрупнікам. Пад канец 90-х прыйшла новая сістэма: стыпендыю налічвалі ў адзін банк і трэба было выстаяць чаргу. Сёння кожны сам сабе і банк, і староста. А ўсё таму, што ў студэнтаў цяпер ёсць пластыкавыя карткі.**

**Наколькі зручна карыстацца сёння банкаўскай карткай? Што рабіць, калі няправільна налічылі стыпендыю і чаму ў некаторых крамах і да сёння адсутнічаюць плацежныя тэрміналы? Адказы шукаў наш спецыяльны карэспандэнт.**

Банкаўская сістэма Беларусі па развіцці сістэмы банкаматаў адпавядае ўсім міжнародным стандартам: на адзін банкамат у нас прыпадае 2600 картак. Як расказаў мне **намеснік старшыні Праўлення ААТ «АСБ Беларусбанк» Сяргей ПІСАРЫК**, пытанні застаюцца толькі з тэрміналамі гандлю і сэрвісу:

— На адзін тэрмінал гандлю і сэрвісу прыпадае 390 картак, у той час як міжнародны стандарт патрабуе толькі 160. Па тых жа стандартах банкамат павінен знаходзіцца ў рэжыме абслугоўвання кліентаў 92 працэнты свайго часу. У Беларусі ж гэты паказчык дасягае 97 працэнтаў. І так на працягу апошніх трох гадоў.

Сапраўды, чаму ў адных крамах тэрміналы ёсць, а ў іншых — няма?

Як патлумачыў **вядучы інспектар аддзела інвестыцыйна-тэхнічнага развіцця Міністэрства гандлю Беларусі Аляксандр СЕЗЕНЬ**, размяшчэнне тэрміналаў, якія забяспечвалі б абслугоўванне пакупнікоў з пластыкавымі карткамі, заканадаўствам урэгулявана. Згодна з пастановай 18/1 Савета Міністраў, магчымасць аплаты банкаўскай карткай павінна быць забяспечана ў гандлёвых пунктах, плошчай ад 650 квадратных метраў, а таксама ў тых аб'ектах, гадавы тавараразварот якіх складае не менш за 15 000 базавых адзінак. Юрыдычныя асобы і ІП, гандлёвая плошча якіх меншая за 650 кв. метраў альбо мае невялікі тавараразварот, таксама могуць усталёўваць плацежныя тэрміналы. Але гэта — па жаданні.

— Усё залежыць ад імкнення саміх уласнікаў гандлю ўсталёўваць такія тэрміналы, — кажа Аляксандр Сезень. — Як паказала практыка, у суб'ектаў гаспадарання няма на сёння эканамічнай зацікаўленасці, каб гэтыя тэрміналы ўсталёўваць. Другая праблема — незацікаўленасць саміх людзей. Звычайна як: налічылі зарплату і каля банкамата кіламетровая чарга, каб зарплату адразу зняць. Людзі не бачаць сэнсу трымаць грошы на картцы. Трэцяя праблема — гэта магчымыя перагрузкі сеткі, якая забяспечвае сувязь гандлёвага аб'екта з банкам. У выніку — збоі ў рабоце сістэмы. А людзі, якія не могуць скарыстацца карткай, скардзяцца, што вінаваты гандаль.

> **Першыя банкаўскія карткі з'явіліся ў Беларусі ў 1997-м. Сёння ў краіне, паводле апошняй інфармацыі Нацбанка, выпушчана больш за 7,1 млн банкаўскіх картак. У сферы гандлю і паслуг усталявана 20 013 тэрміналаў. У сферы гандлю і грамадскага харчавання — 15 000. Лідарам па выпуску банкаўскіх картак у Беларусі з'яўляецца Беларусбанк. Ён стаў першым банкам, які перавысіў мяжу ў 4 мільёны эмісіяваных банкаўскіх картак.**

Картка — сродак універсальны, з яго дапамогай можна не толькі атрымаць стыпендыю, але і грашовы перавод, калі і бацькі таксама з'яўляюцца карыстальнікамі гэтага банка. Больш за тое, як паведамілі ў бухгалтэрыі БДУ, студэнты галоўнай ВНУ краіны нават за навучанне цяпер могуць заплаціць праз інфакіёск...

> **Міжнародныя банкаўскія карткі выкарыстоўваюцца ў міжнародных сістэмах плацяжоў. Найбольш вядомыя і папулярныя плацежныя сістэмы — Visa (Visa Electron, Visa Classic, Visa Gold, Visa Platinum) і Mastercard (Cirrus, Maestro, Mastercard Mass). Visa і Mastercard — карткі міжнароднага класа, падыходзяць для разліку ва ўсім свеце.**

Як расказала **Іна НАВУМАВА, начальнік цэнтра банкаўскіх паслуг ААТ «Белінвестбанк»**, з якім ажыццяўляе ўсе грашовыя аперацыі БДУ, выкарыстоўваць пластыкавыя карткі ва ўніверсітэце пачалі дзесяць гадоў таму:

— Усё пачыналася з праграмы пералічэння на пластыкавыя карткі зарплаты супрацоўнікам, а пасля на карткі пачалі налічваць і стыпендыі студэнтам. Сумеснымі намаганнямі з БДУ мы дабіліся магчымасці плаціць за навучанне і праз інфакіёскі. У хуткім часе праз інфакіёск можна будзе заплаціць за інтэрнат, студэнцкі білет і заліковую кніжку.

Паводле слоў Іны Навумавай, на сёння па краіне ідзе паступовы працэс пераходу да картак «БелКартМ».

— Супрацоўнікі і студэнты БДУ такімі карткамі будуць забяспечаны бясплатна, карткамі Visa можна будзе карыстацца паралельна. У хуткім часе першакурснікі пры паступленні будуць атрымліваць ужо не адну, а дзве карткі: БелКартМ і Visa. Рахунак у студэнта адзін, але картак да рахунка прывязана дзве. БелкартМ падыдзе для разлікаў у Беларусі, Visa — тып універсальны, спатрэбіцца для паездак за мяжу. Гэта дасць магчымасць студэнту выбіраць, якой карткай ён будзе расплачвацца ў пэўнай краме.

— У БДУ пластыкавымі карткамі карыстаюцца каля 8 тысяч студэнтаў і яшчэ 5,5 тысячы супрацоўнікаў, — кажа **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення бухгалтарскага ўліку БДУ Людміла ФУРСЕВІЧ**. — Большасць разлікаў ажыццяўляюцца па безнаяўнай форме. Таму ад такога азначэння, як «каса», мы ўжо даўно адышлі.

Асноўны недахоп банкаўскіх картак — гэта немагчымасць убачыць непасрэдна, колькі грошай у цябе засталося. Атрымліваецца, што грошы ў цябе і ёсць, і няма адначасова. Некаторыя студэнты наракаюць і на тое, што сума налічаных грошай часам змяняецца, а так як грошы налічваюцца па безнаяўнай форме, то ты і не ведаеш, колькі канкрэтна павінен атрымоўваць.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




Па ўсіх пытаннях наконт стыпендыі, як раіць **начальнік галоўнага ўпраўлення бухгалтарскага ўліку і фінансаў, галоўны бухгалтар БДУ Таццяна КАЎШЭВІЧ**, варта спачатку звярнуцца ў дэканат, калі пытанне не вырашыцца там, можна смела ісці ў бухгалтэрыю.

А што рабіць, калі затрымалі стыпендыю?

— Стыпендыі ў нас ніколі не затрымліваюцца, — супакойвае **начальнік аддзела матэрыяльнага забеспячэння навучэнцаў БДУ Вольга АЛЯКСЕЙЧЫКАВА**. — Выплаты пачынаюцца з 21-га дня кожнага месяца. Іншая рэч, што сродкі на картку паступаюць на працягу дня. Выплаты ў кожнага факультэта адбываюцца па-свойму. У нас дзейнічае сістэма, згодна з якой, усе факультэты падзеленыя на пяць дзён тыдня, у залежнасці ад гэтага студэнты розных факультэтаў атрымліваюць стыпендыю ў розныя дні.

> **БелКартМ — нацыянальная плацежная сістэма Беларусі, карткай гэтага тыпу можна карыстацца толькі на тэрыторыі Беларусі**

— Увогуле з боку бухгалтэрыі ніякіх затрымак быць не можа, — дадае **галоўны бухгалтар БДУ Таццяна КАЎШЭВІЧ**. — Гэта бюджэтныя сродкі, і яны не могуць быць затрыманыя. Іншая рэч — калі ўзнікаюць збоі ў працы самой камп'ютарнай сістэмы, бо пералічэнне стыпендый — працэс камп'ютарызаваны. Але такія выпадкі амаль адзінкавыя.

«Студэнтам цяпер добра, — кажа мая знаёмая, якая скончыла ўніверсітэт у 80-я. Ніякіх табе чэргаў, ніякіх табе старастаў. Сам сабе пан».

Гэта сапраўды так. Толькі калі студэнта не зацікавіць, ён і далей будзе ўзгадваць пра картку толькі ў дзень стыпендыі. Нядаўна размаўляў з дзяўчынай-першакурсніцай, якая выказала геніяльную думку: «Падумаеш, картка. Што мне на яе, глядзець? Вось калі б па безнаяўным разліку ў крамах рабіліся зніжкі, я па-іншаму на яе глядзела б. Як на вялікую каштоўнасць». Не ведаю, наколькі рацыянальнай можа быць такая прапанова, але падумаць тут ёсць над чым.

**Ілья ЛАПАТО.**

### КАРЫСНА ВЕДАЦЬ:

**1. Пры карыстанні банкаматам, старайцеся стаяць як мага бліжэй да банкамата, а ПІН-код уводзіць сярэднім пальцам рукі, закрываючы такім чынам астатнімі пальцамі клавіятуру.**

**2. Калі вашу картку банкамат так і не вярнуў, неабходна, не адыходзячы ад банкамата (інфакіёска), адразу яе заблакаваць. Калі вы карыстальнік SMS-банкінгу альбо М-банкінгу, то зрабіць гэта можна праз мабільны тэлефон. Таксама можна пазваніць у кругласутачную сэрвісную службу ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» па тэлефоне 8 (017) 299 25 26.**

**3. Пры блакіроўцы карткі вам неабходна паведаміць сваё імя, прозвішча, назву банка, нумар карткі і слова-пароль.**

Школа юнкараў

# Адзінокае сэрца хутчэй астывае

Ехаў у метро на курсы па падрыхтоўцы да паступлення ў Інстытут журналістыкі. Выйшаў на станцыі метро «Інстытут культуры», рушыў да выхаду. Вакол мітуслівыя людзі кудысьці спяшаюцца па сваіх патрэбах, і сярод гэтай хаатычнай карціны выдзеліўся адзін стары, які стаяў і нешта прадаваў. Набліжаючыся да яго, я ўсё лепш бачыў яго знешнасць: стары быў ростам, можа, метр пяцьдзясят, шчупленькі, худзенькі, ногі падціснутыя адна да адной ад холаду. Я не змог прайсці міма і вырашыў да яго падысці.

— Прывітанне, я Сяргей. Дазвольце пацікавіцца, а што вы тут прадаяце?

— Прывітанне, а я Адам. Прадаю рукавічкі, звязаныя нябожчыцай-жонкай.

— А з якой мэтай? Вам не хапае пенсіі на жыццё?

— Ды не тое што не хапае. Проста на пенсіі рабіць няма чаго, вось і распрадаю рэчы. Ну і яшчэ, зразумела, каб зарабіць крыху.

— Можна даведацца, а колькі вам гадоў, ці дапамагае вам дзяржава?

— Мне восемдзясят чатыры. Дзяржава плаціць пенсію, аднаму хапае. Сын часта прыязджае, хоча, каб з ім паехаў у Іркуцк. Але я адмаўляюся, таму што тут добра. Праўда, бывае часам адзінока таму, што жыву адзін.

— Вам не холадна тут стаяць увесь дзень?

— Не, я ў шкарпэтках вязаных (*усміхнуўся*). Так што мне не холадна.

...Я адыходзіў і думаў: а што са мной будзе ў старасці? Дзеці раз'едуцца па свеце, і я застануся адзін. Адзінота ў старасці непазбежная. Магчыма і ёсць у гэтым штосьці добрае: застацца са сваімі думкамі, ні ад каго не залежаць, рабіць, што захочацца. Але гэтыя станоўчыя факты нельга параўнаць з тым, што ўжо не будзе каму расказаць цікавую гісторыю, прыгадаць мінулае, навучыць малодшых. З гадамі цела будзе слабець і не будзе каму дапамагчы данесці цяжкія сумкі.

А магчыма будзе інакш. Кожныя выхадныя забягуць да мяне ўнукі, залезуць на калені і будуць слухаць іх любімую казку. А ў дзень нараджэння павіснуць у мяне на шыі і картавячы прама ў вуха будуць шаптаць чароўныя словы, выбіваючы слязу радасці. Ці ж не добрая такая старасць?

Штогод у час летніх канікулаў я бываў на малой радзіме майго бацькі ў вёсцы Усохі Клічаўскага раёна. Па суседству жыла пенсіянерка Яніна Пятроўна. Трэба бачыць, як мянялася яна, калі з горада прыязджала дачка з унучкай. Бабуля не хадзіла, а лятала. Увесь дзень рухалася, нягледзячы на васьмідзесяцігадовы ўзрост. І абавязкова штосьці насіла. То збан малака, то агурочкі і клубніцы, то букет жывых кветак.

На жаль, у вёсцы адзінокіх старых больш. Часам сацыяльны работнік — адзіны чалавек, з якім яны размаўляюць на працягу тыдня. Хоць юрыдычна яны не адзінокія. У іх ёсць дзеці. Але лёс іх раскідаў па розных месцах і ў асноўным па гарадах. Пажылыя людзі не хочуць абцяжарваць сваіх дзяцей. Ды і не прывыклі яны жыць у вышынных дамах. Але пабыць пару месяцаў у цёплай гарадской кватэры, калі на вуліцы зіма і люты мароз, яны, безумоўна, пагадзіліся б. Адчуўшы клопат дзяцей, бацькі пражывуць даўжэй, а значыць — і вы таксама. Не дарма ў народзе кажуць: пахаваў бацькоў, пачынай рыхтавацца і сам.

Не пакідайце сваіх родных сам-насам з часам, тэлефануйце і прыязджайце. Не забывайце тых, хто вас стварыў, выхаваў і падрыхтаваў да выхаду ў свет. Памятайце, што адзінокае сэрца хутчэй астывае.

**Сяргей ЯГЕЛА,**
**вучань гімназіі № 20 г. Мінска.**

Цьенчэн ВОБГА:

# «НІКОЛІ НЕ БЫЎ ФОТАМАДЭЛЛЮ, АЛЕ ЎСЕ ПРА ГЭТА ПІШУЦЬ»

Цьенчэн Вобга — новы набытак футбольнага «Дынама» ў гэтым міжсезонні. Футбаліст перайшоў сюды з футбольнага клуба «Мінск», дзе выступаў пераважна за дубль. Не ўсе бачылі на полі 18-гадовага нападаючага, тым не менш некаторыя балельшчыкі ўжо называць яго другім Дзідье Драгба, іншыя параўноўваюць яго нават з Філіпа Індзагі. Сябры па камандзе коратка называюць яго Цьеры. Галоўны трэнер дынамаўцаў Сяргей Гурэнка па-свойму бачыць ролю гэтага футбаліста на полі: у спарынгах ён гуляе на пазіцыі цэнтральнага абаронцы. У любым выпадку, гулец з такой экзатычнай знешнасцю не можа не прыцягваць увагу.

***— Цьенчэн, раскажыце пра сябе. Знешнасць і прозвішча выдаюць у вас не беларускае паходжанне...***

— Так, мой тата з Камеруна, ён вучыўся ў Мінску ва ўніверсітэце. Пазнаёміўся тут з мамай. Я нарадзіўся ў Беларусі, і мяне выхавала бабуля, гэта мой самы блізкі чалавек. Бабуля і прывяла мяне ў футбольную секцыю, калі мне было сем гадоў. Маім першым трэнерам быў Максім Мікалаевіч Карповіч, потым я быў у «Змене», каля года трэніраваўся у Віктара Георгіевіча Ганчарэнкі, ён на мяне вельмі моцна паўплываў, а потым трапіў у дубль «Мінска».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ - 2010
СТАР. 2

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНОЛОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ

ПРОДОЛЖАЕТ НАБОР НА ПОДГОТОВИТЕЛЬНЫЕ КУРСЫ ПО ПОДГОТОВКЕ К ЦЕНТРАЛИЗОВАННОМУ ТЕСТИРОВАНИЮ.

В УНИВЕРСИТЕТЕ ПРОВОДИТСЯ РЕПЕТИЦИОННОЕ ТЕСТИРОВАНИЕ.

Тел. (8 017) 227 73 89. www.bstu.unibel.by

ВНИМАНИЮ АБИТУРИЕНТОВ!
Вы можете уже попытаться стать студентом.
Открыт приём на заочную форму обучения (зимний поток).

Высшее, второе высшее образование по специальностям:
- юриспруденция;
- финансы и кредит;
- бухгалтерский учёт, анализ и аудит;
- антикризисное управление;
- экономика и управление на предприятии;
- менеджмент организации.

Преимущества обучения в аккредитованных ВУЗах:
- Выпускники ВУЗов получают ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ДИПЛОМЫ, которые имеют полную юридическую силу в РБ и признаются в других европейских государствах.
- Доступная стоимость обучения;
- Обеспечение всех студентов-заочников общежитием;
- Студенты имеют право на отсрочку от призыва на военную службу;
- Сроки подготовки специалистов в соответствии с учебными планами и госстандартами:
3,5 года на базе среднего специального профильного (техникум) и высшего образования;
6 лет на базе среднего образования;
- Вступительные испытания проходят непосредственно в ВУЗах (без предъявления ЕГЭ);
- Возможность выбора ближайшего потока: I поток – до 10 марта.



Для получения подробной информации о порядке поступления и обучения обращайтесь в «ВПО ПРОФКОНСУЛЬТАНТ»: 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, д. 20 «А», тел.:
(017) 200 82 57, 200 63 51
GSM (029) 509 82 57, (044) 709 82 57
www.vpo.by

Свидетельство о государственной регистрации № 191170822 от 26.05.2009 г. Мингорисполкома. УНН 191170822.

# «НІКОЛІ НЕ БЫЎ ФОТАМАДЭЛЛЮ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— І вы не здымаліся ў рэкламе вядомага беларускага вытворцы бялізны?***

— Ніколі. Футбол займае ўвесь час. І падвучыцца яшчэ не лішнім было б. Я вучуся на другім курсе на эканамічным факультэце БДУ.

***— У школе, напэўна, добра вучыліся?***

— Та-ак. Фізіку не ведаю, хімію таксама. Таму і пайшоў на эканамічны — там трэба было здаць французскую і беларускую мову, ну і матэматыку.

***— З такой экзатычнай знешнасцю вас, напэўна, часта прымаюць за замежніка і імкнуцца дапамагчы?***

— Часам здараецца. Хоць я лічу, што знешнасць не павінна адыгрываць такую ролю.

***— Дзяўчаты на вуліцах паварочваюцца вам услед?***

— У Беларусі — так. За мяжой ніхто на гэта не звяртае ўвагі.

***— Вы нядаўна сталі адным з навабранцаў сяміразовага чэмпіёна Беларусі. Як прынялі вас у клубе?***

— Выдатна. Я і раней сябраваў з хлопцамі з «Дынама». Мы пазнаёміліся яшчэ ў юнацкай зборнай.

***— Як вы даведаліся, што будзеце выступаць за бела-блакітных?***

— Мне патэлефанавалі і запрасілі. Доўга над такім запрашэннем не раздумваюць.

***— Як будзе называцца ваша будучая прафесія?***

— Футбаліст.

***— Ды я не пра тое. Вы ж вучыцеся на эканамічным факультэце...***

— А-а... Эканаміст-менеджар. Праўда зараз, пакуль мы былі на зборах у Лагойску з камандай, у мяне была сесія. Ні на адзін экзамен я так і не з'явіўся. А зараз з'язджаем на зборы на Кіпр. Потым прыйдзецца даганяць.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**



# ПАТЭНТНЫЯ СПРАВЫ

**Студэнт БДУ Дзіма Шчагрыкевіч яшчэ ў школьныя гады займаўся даследаваннямі водных варонак. У ліцэі са сваімі сябрамі яны занялі першае месца на міжнароднай навуковай канферэнцыі школьнікаў. Ва ўніверсітэце яго выкладчык сказаў, што хлопцы зрабілі адкрыццё...**

Аднак запатэнтаваць сваё вынаходніцтва Дзіма пакуль не можа. Як паведамілі мне ў Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці, ідэі і адкрыцці не патэнтуюцца.

### «Лятаючы бранявік»

— Адкрыццё — гэта тое, што было ў прыродзе, але чалавек гэта заўважыў, «знайшоў», — расказвае кансультант цэнтра Людміла Шах. — Але на базе таго, што ён знайшоў, можа быць прыдумана, напрыклад, нейкая прылада, вось яна і патэнтуецца.

Каб ваша вынаходніцтва было запатэнтаваным, яно абавязкова павінна адпавядаць некалькім крытэрыям. Першы крытэрый — навізна. Прычым сусветная. А гэта значыць, што да вас яго ў свеце ніхто не прыдумаў. Калі ж ужо існуе такое вынаходніцтва, патэнта вы не атрымаеце. Другі крытэрый — прамысловая прымянняльнасць: што вынаходніцтва можа быць прыменена ў вытворчасці.

— Гэты крытэрый вельмі важны, — расказвае Людміла Шах, — бо часам і на «вечны рухавік» прэтэндуюць. Памятаю, калі я яшчэ працавала экспертам у папярэдняй экспертызе, адзін дзядуля даслаў заяўку на «лятаючы бранявік». Гэта была пласціна, у якую быў забіты звычайны загнуты цвік. Праз яго перакінута вяровачка, а да абодвух яе канцоў прывязаныя былі звычайныя вёдры з вадой. Уся гэтая канструкцыя была апушчана ў бочку. І дзядуля вырашыў, што адзін раз ён націсне на вядро — яно хітнецца, а далей вёдры ўжо будуць рухацца самі. А так як усё будзе рухацца, бочка будзе лятаць. Тут элементарна парушэнні закона энергіі.

Калі ў прамысловасці ваша вынаходніцтва прымяніць нельга, то патэнта таксама не атрымаць. Яшчэ адзін немалаважны параметр — вынаходніцкі ўзровень. Ён азначае, што вынаходніцтву недастаткова проста не паўтараць ужо вядомыя тэхнічныя рашэнні. Яно павінна рабіць істотны ўнёсак у існуючы ўзровень тэхнікі. Вынаходніцтвам не можа быць названа хоць і новае, але цалкам відавочнае рашэнне. Напрыклад, каб атрымаць пераносны станок, вы вырашылі зрабіць яго з лёгкага металу. Відавочна, што калі нейкую прыладу трэба пераносіць з сабой, яна павінна быць зроблена з лёгкага матэрыялу. У гэтым выпадку няма вынаходніцкага ўзроўню. Патэнт не выдаецца. Таму што гэта відавочнае рашэнне.

> **У 2009 годзе ў Беларусі было зарэгістравана 1297 новых патэнтаў на вынаходніцтвы, 1119 патэнтаў на карысныя мадэлі і 230 патэнтаў на прамысловы ўзор.**

### Дызайн таксама можна патэнтаваць

У Беларусі можна атрымаць патэнт на вынаходніцтва (тэхналогія, прылада, рэчыва, прымяненне, біятэхналагічны прадукт). Напрыклад, спосаб атрымання лекаў, які будзе ўключаць перамешванне кампанентаў і г.д. Тэрмін дзейнасці патэнта на вынаходніцтва — 20 гадоў.

Патэнт можна атрымліваць і на карысную мадэль. Напрыклад, прыдумалі вы, што электрачайнік не павінен быць толькі металічным са спіралямі на дне, і зрабілі яго пластыкавым. Вось гэтую палепшаную мадэль вы і можаце запатэнтаваць. Для атрымання патэнта на карысную мадэль існуе толькі два крытэрыі — навізна і прамысловая прымяняльнасць. Вынаходніцкі ўзровень не патрабуецца. Патэнт выдаецца пад адказнасць заяўніка. Калі нехта заўважыць, што падобная мадэль ужо была, то патэнт можа быць ануляваны. А тэрмін яго дзейнасці — пяць гадоў.

Можна таксама запатэнтаваць і прамысловыя ўзоры, а прасцей кажучы, дызайн якой-небудзь прылады.

— Гэта не вынаходніцтва, а мастацка-канструктарскае рашэнне, якое вызначае знешні выгляд мадэлі, — тлумачыць Людміла Леанідаўна. — Выдаючы патэнт на прамысловы ўзор, мы толькі правяраем, ці правільна аформлена заяўка. Калі высветліцца, што дызайн такі вядомы, то патэнт таксама можна абскардзіць.

### Беларускі патэнт — 157 тысяч рублёў, амерыканскі — каля 20 тыс. долараў

— Да нас звяртаюцца, каб атрымаць беларускі патэнт, — расказвае Людміла Леанідаўна. — Ён будзе дзейнічаць толькі на нашай тэрыторыі. Калі ж палякі ці амерыканцы прачытаюць апісанне і на сваёй тэрыторыі пачнуць рабіць такое ўстройства, то яны не парушаць ніякія правы.

Каб прайсці працэдуру патэнтавання ў Беларусі, патрэбна заплаціць прыкладна 157 500 рублёў. Пасля трэба плаціць штогадовыя пошліны, пачынаючы з трэцяга года дзеяння патэнта на вынаходніцтва, для яго падтрымання. Сума складае прыкладна 17 500 рублёў у год. Калі 20-гадовы тэрмін пройдзе, то патэнт губляе сваю сілу, усе могуць ім скарыстацца і ніякіх пошлін на падтрыманне плаціць не трэба.

Можна таксама падаць заяўку на выдачу патэнта ў любую краіну, пры ўмове, што адпавядае крытэрыям, пра якія мы казалі вышэй (у прынцыпе, аднолькавыя крытэрыі). Ёсць чатыры рэгіянальныя канвенцыі, зарэгістраваўшыся ў якіх можна атрымаць патэнт у некалькіх краінах — еўрапейская, еўразійская і дзве афрыканскія.

— Спынімся на еўразійскай патэнтнай канвенцыі. Сюды ўваходзяць былыя дзяржавы СССР, акрамя трох прыбалтыйскіх, Грузіі, Украіны і Узбекістана, — тлумачыць Людміла Шах. — І калі трэба абараніць патэнт на тэрыторыі гэтых дзевяці краін, то неабходна падаць заяўку ў еўразійскае патэнтнае бюро ў Маскву. Аналагічна аформіць заяўку і прайсці экспертызу.

Еўразійскі патэнт для Беларусі як краіны-ўдзельніцы складае прыкладна 250 долараў. Каб атрымаць амерыканскі патэнт для нашага заяўніка, трэба мець 20 тыс. долараў. Патрэбна скарыстацца паслугамі патэнтнага паверанага, таму што непасрэдна з арганізацыяй мы зносінаў мець не можам.

— Тут, праўда, ёсць адзін нюанс, — папярэджвае Людміла Леанідаўна. — Калі вы падалі заяўку ў нашай краіне, вам выдалі патэнт. А пасля вы падалі заяўку, напрыклад, у амерыканскае ведамства, то вам могуць адмовіць на падставе таго ж вашага вынаходніцтва. Таму патэнтаваць у некалькіх краінах трэба хутка. Згодна з Парыжскай канвенцыяй, на працягу 12 месяцаў з моманту падачы заяўкі ў сваёй краіне вы можаце падаць заяўку ў іншыя краіны — удзельніцы гэтай канвенцыі. І папрасіць прыярытэт роднай краіны. Калі вы накіруеце заяўку ў іншую краіну пазней за некага, але ў сваёй краіне вы зрабілі гэта раней, то перавага будзе за вамі.

### Выкарыстоўваецца толькі частка ўсіх патэнтаў

— На кансультацыю да мяне прыходзяць, у асноўным, мужчыны. Шмат падаюць юрыдычныя асобы, — тлумачыць Людміла Шах. — Цяпер свет такі, што Кулібіных, такіх вось адзіночак, практычна быць не можа. Калі патрэбна вырашыць сур'ёзныя глабальныя праблемы, то працуе цэлы інстытут і тады атрымоўваюцца якасныя вынаходніцтвы.

Патэнцыйна ўсе патэнты могуць прыносіць прыбытак. Але магчымасць атрымаць патэнт і ўзамен нічога не атрымаць ёсць. Такога, каб выкарыстоўваліся ўсе запатэнтаваныя вынаходніцтвы, няма ні ў адной краіне свету. Калі выкарыстоўваецца 3 працэнты вынаходніцтваў, то гэта лічыцца выдатнай лічбай.

Цяпер Дзіма актыўна займаецца распрацоўкай спосабаў прымянення свайго вынаходніцтва. Па словах хлопца, ён абавязкова запатэнтуе вынік і пастараецца зарабіць на ім грошы.

**Настасся ЗАНЬКО.**




Ёсць пытанне

# ЦТ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: ПА ЯКІХ ПРАВІЛАХ АРФАГРАФІІ?

**Табе, абітурыент - 2010!**

***— Патлумачце, калі ласка, да чаго рыхтавацца абітурыентам 2010 года? Ці не зменяцца, як гэта было летась, Правілы прыёму ў ВНУ непасрэдна напярэдадні ўступных іспытаў?***

— У Міністэрстве адукацыі запэўніваюць, што ніякіх прынцыповых змяненняў у парадак прыёму ўносіць не плануецца. Усе змяненні, што рыхтуюцца, будуць мець, хутчэй, працэдурна-тэхнічны характар. Так, па выніках мінулагодняй прыёмнай кампаніі дзяржаўная камісія па кантролі за ўступнымі іспытамі звяртала ўвагу на неўрэгуляванасць правілаў падачы дакументаў у творчыя ВНУ і ССНУ на платныя месцы, а таксама на праблему апошняга дня падачы дакументаў. Колькі б абітурыентам часу ні давалі, а яны ўсё роўна штурмуюць прыёмныя камісіі ў апошні дзень падачы дакументаў. Таму падчас прыёмнай кампаніі 2010 года апошняе абнаўленне інфармацыі аб ходзе прыёму дакументаў будзе зроблена, як мяркуецца, у 15 гадзін апошняга дня падачы дакументаў, а ўваход у будынак, дзе працуе прыёмная камісія, зачыніцца ў 18 гадзін. Такім чынам тры гадзіны будуць дадзены абітурыентам на роздум і ажыццяўленне асэнсаванага выбару. Для абітурыентаў, якія будуць паступаць у ССНУ на аснове базавай адукацыі, пісьмовыя ўступныя іспыты будуць праводзіцца па цэнтралізаваных заданнях. Даручэнне распрацаваць гэтыя заданні было дадзена Рэспубліканскаму інстытуту кантролю ведаў. Будуць унесены таксама змяненні ў «Палажэнне аб парадку арганізацыі і правядзення ЦТ», у Пастанову Савета Міністраў «Аб спагнанні платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу абітурыентаў у цэнтралізаваным тэсціраванні» і ў «Інструкцыю аб парадку правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі і тэсціравання ў ВНУ». Плануецца таксама распрацаваць адзіную методыку разліку колькасці месцаў для прыёму па асобным конкурсе сельскіх абітурыентаў і гараджан пры іх паступленні ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

***— Ці захаваецца ў гэтым годзе папярэдні прафадбор пры паступленні на спецыяльнасць «правазнаўства»? І ці трэба яго праходзіць тым, хто плануе атрымліваць адукацыю на завочнай платнай форме навучання?***

— У тым, што папярэдні прафадбор захаваецца, можаце не сумнявацца, праўда, у Інструкцыю аб парадку яго правядзення будуць унесеныя , як мы ўжо казалі вышэй, некаторыя карэкціроўкі. На сённяшні дзень дакладна можна казаць аб тым, што прафесійна-псіхалагічную гутарку павінны будуць прайсці ўсе абітурыенты, якія плануюць паступаць у гэтым годзе на спецыяльнасці «дзяржаўнае кіраванне», «дзяржаўнае кіраванне і права», «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «міжнародныя адносіны», «міжнароднае права», «правазнаўства», «эканамічнае права», «журналістыка» (у тым ліку калі яна з'яўляецца дадатковай спецыяльнасцю), «міжнародная журналістыка» і «мытная справа». Варта мець на ўвазе, што праз папярэдні прафадбор павінны будуць прайсці ўсе, хто плануе паступаць на завочную, вячэрнюю, дыстанцыйную формы навучання, на паралельнае навучанне, на навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, ці атрымліваць другую і наступную вышэйшую адукацыі як за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, так і на ўмовах аплаты фізічнымі і юрыдычнымі асобамі. Не будзе залішнім таксама ведаць, што абітурыент мае права прайсці прафесійна-псіхалагічную гутарку па кожнай групе спецыяльнасцяў, напрыклад, для паступлення на спецыяльнасці «правазнаўства» і «дзяржаўнае кіраванне». Для гэтага яму трэба будзе зарэгістравацца асобна на кожную групу спецыяльнасцяў. Аднак абітурыентам катэгарычна забараняецца рэгістравацца на адну і тую ж спецыяльнасць (групу спецыяльнасцяў) у розных ВНУ. Рэгістрацыя грамадзян для ўдзелу ў гутарцы будзе весціся ў сакавіку. Абітурыенту, які падаў заяву для ўдзелу ў гутарцы, паведамяць пра месца і час правядзення гутаркі асабіста ці па пошце. Летась на праходжанне прафесійна-псіхалагічнай гутаркі зарэгістраваліся 16 тысяч 151 абітурыент. Парушылі парадак правядзення гутаркі 132 абітурыенты, якія зарэгістраваліся на адну спецыяльнасць адразу ў некалькіх ВНУ. А не прайшлі папярэдні прафадбор 103 абітурыенты, што складае 0,6 працэнта ад агульнай колькасці прэтэндэнтаў.

***— Колькі балаў трэба будзе набраць на ЦТ, каб быць дапушчаным да ўдзелу ў конкурсе?***

— Летась ніжняя мяжа тэставага бала была адменена, і ўсім абітурыентам, якія атрымалі на тэсціраванні адзін бал і больш, была дадзена магчымасць удзельнічаць у конкурсе. Аднак пасля прыёмнай кампаніі гучалі прапановы вярнуцца да практыкі абмежавання выдачы сертыфікатаў абітурыентам з нізкімі баламі. Праўда, арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання гэта меркаванне не падзяляюць. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў упэўнены ў тым, што якасны склад паступіўшых не залежыць ад наяўнасці ці адсутнасці парога прахаднога бала. Усё роўна на ўваходзе ў ВНУ існуе канкурэнцыя, якая дазваляе паступіць на бюджэтную форму навучання толькі самым падрыхтаваным абітурыентам.

***— Хацелася б даведацца, чаму за ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні трэба плаціць 16 100 рублёў за кожны прадмет, калі на рукі выдаюць толькі бланкі і лісток з заданнямі. Няўжо цяпер папера такая дарагая?***

— У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў патлумачылі, што ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні без выдачы сертыфікату — справа цалкам добраахвотная. Рыхтавацца да ўдзелу ў ЦТ можна і самастойна. Разам з тым, каб у далейшым не ўзнікала такіх непаразуменняў, трэба патлумачыць, што сума ў памеры 16 100 рублёў, якая ўносіцца за ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні, уключае плату за распрацоўку, экспертызу і тыражаванне тэставых заданняў, друкаванне бланкаў адказаў, дастаўку матэрыялаў у пункты тэсціравання і назад, апрацоўку іх вынікаў, а таксама аплату працы арганізатараў, арэнду памяшканняў у пунктах правядзення тэсціравання, падаткі і камісійныя зборы.

***— Ці будуць на цэнтралізаваным тэсціраванні па беларускай мове ў 2010 годзе ўключацца заданні, што абапіраюцца на новыя правілы беларускай арфаграфіі?***

— Закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ўступае ў дзеянне з 1 верасня 2010 года, таму тэставыя заданні будуць складацца без уліку новых правілаў, — запэўнілі нас арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання.

***— Падкажыце, ці можа сірата бясплатна прайсці рэпетыцыйнае тэсціраванне?***

— На жаль, не можа, паколькі ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні не з'яўляецца абавязковай працэдурай, а адносіцца да платных паслуг. У РІКВ патлумачылі, што ў цэнтралізаваным тэсціраванні сіроты ўдзельнічаюць бясплатна. Гэта рэгламентавана Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб спагнанні платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні» ад 16 красавіка 2008 года № 565 п.1.1.2.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ТАНЦАВАЛЬНЫ МАРАФОН БІ-БОЯЎ

**Адборачны тур адкрытага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па брэйк-дансу «Сіла двух-2010» адбыўся днямі ў Мінску.**

Сумесны танцавальны праект сезона арганізавалі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і зборная Беларусі па брэйк-дансе. На танцпляцоўцы Палаца пазашкольнай работы «Золак» у адборачным туры чэмпіянату за выхад у фінал танцавальнага марафона змагаліся наймацнейшыя бі-боі Мінску (b-Boys — прадстаўнікі хіп-хоп культуры). Чэмпіянат «Сіла двух» стартаваў 16 студзеня ў Брэсце.

За гэты час бітвы беларускіх бі-бояў прайшлі ў Гродне, Віцебску і Магілёве. Усяго ў чатырох адборачных турах прынялі ўдзел 67 дуэтаў. Фінал чэмпіянату адбудзецца 13 лютага ў Мінску.

**Кар. БЕЛТА.**

На свае вочы

# Амерыка: нататкі пералётнай птушкі

**УРАЖАННЕ. ПЕРШЫ ПАЛЁТ.**

Зямля пад крылом самалёта падобная на лапікавую коўдру. Звычайнае параўнанне... Але больш дакладнага не знайсці. Рознакаляровая матэрыя палёў засеяна пацерынкамі і бліскаўкамі азёраў, вышыта муліна-дарогамі і абвіта атласнымі стужкамі рэк. Дзесьці часцей, дзесьці радзей бачныя ваўняныя ўстаўкі — лясы. І ўсё зіхаціць і пераліваецца, і самалёт як быццам кружыць над адной кропкай, так марудна змяняецца пейзаж у ілюмінатары...

Прачынаюся. Вышыня каля дзесяці тысяч метраў, шэсць гадзін палёту, а пад намі — Грэнландыя! Нават вата аблокаў не можа схаваць пакрытыя зіхатлівым срэбным снегам вяршыні, якія цягнуць свае галовы да нас, сотні-другой людзей у жалезнай птушцы. Кідаемся ад аднаго ілюмінатара да другога, спрабуем убачыць як мага больш, увабраць у сябе прыгажосць і непрыступнасць гэтага ледзянога вострава, на якім наўрад ці каму-небудзь з нас давядзецца пабываць. А ён насамрэч прыгожы, гэты белы на геаграфічнай і фіялетавы на палітычнай картах востраў, прыгожы нават з вышыні ў дзесяць тысяч метраў, вышыні, на якой мы недасягальныя нават для Джамалунгмы. Ніколі не была на Джамалунгме, але не думаю, што яна больш дзівосная, чым тое, што я бачыла, пралятаючы над Грэнландыяй, Снежнай каралевай нашай планеты, недаступнай і цудоўнай.

І зноў белая смуга аблокаў пад намі, якая аднак не дазваляе ўжо што-небудзь разгледзець...

...Заклала вушы. Зніжаемся? Вэлкам ту юэсэй! Нью-Ёрк уразіў мноствам агнёў, здаецца, што сядзіш на полі, засеяным светлячкамі. Велізарнае мора раскінулася перад намі, і ззаду нас, і з усіх бакоў, і мы садзімся проста ў гэтае мора ліхтароў, фараў, запаленых вокнаў, рэкламных шыльдаў...

**УРАЖАННЕ. ЦЯЖКАСЦІ ПЕРАКЛАДУ**

Амерыка не выклікала ў мяне культурны шок. Я адразу ж пазнаёмілася з суайчыннікамі, а дзве і тым больш тры галавы, як вядома, лепш спраўляюцца з перакладам, чым адна гаротная галоўка. Вось так мы і ехалі ўтраіх, перасякаючы краіну з поўначы на поўдзень, штат за штатам, на шэсць вушэй слухаючы тое, што нам гаварылі, і трыма галавамі апрацоўваючы атрыманую інфармацыю. Пасажыры аўтобуса не надта нас турбавалі (хутчэй ужо мы іх!), ну балбочуць сабе на заднім фоне, як тэлевізар.

Цяжкасці пачаліся, калі мы дасягнулі месца прызначэння. Я засталася ў адзіноце. І калі першы раз прыйшла на працу, ужо ніхто не мог мне падказаць, як перакладаецца тое ці іншае слова, даводзілася здагадвацца (часта няправільна) або прасіць растлумачыць іншымі словамі (часам яшчэ больш складанымі і незразумелымі). Мне ўвесь час здавалася, што ўсё гэта розыгрыш, што размаўляюць яны не па-сапраўднаму (ну, не могуць людзі насамрэч думаць па-англійску!), і вось зараз хто-небудзь рассмяецца і скажа на маёй мове, маўляў, гэта быў жарт такі. Але ніхто не смяяўся (хіба што з мяне) і не прамаўляў суцяшальныя словы. Мне даводзілася прывыкаць.

Прывыкала я чамусьці доўга і пакутліва. Відаць, вось так праявіўся ў мяне згаданы ўжо культурны шок. Па-першае, маёй школьна-інстытуцка-курсавой англійскай відавочна было недастаткова для свабодных стасункаў. Словы забываліся, часы і парадак слоў пастаянна блыталіся. Размаўляла я па дзіўных і мне самой не знаёмых правілах, не падобных на правілы якой-небудзь іншай мовы. Дзіўна, але ЯНЫ неяк мяне разумелі, значыць, хоць нешта было правільна.

Па-другое, нейкі час у мяне проста язык не паварочваўся, не жадаў вымаўляць англійскія словы. Ці верыце, ці не, але вельмі цягнула размаўляць па-беларуску не толькі з «абарыгенамі», але і з рускімі, якіх, дарэчы, у Амерыцы аж зашмат. Гэта было нешта накшталт пратэсту, абвастрэння супраціўляльнасці арганізма. Імунітэт да татальнай амерыканізацыі.

Даволі доўгі час я маўчала. Амерыканскіх сяброў было ўжо даволі, а я ўсё маўчала. Слухала. Саромелася. Мне здавалася, што яны ўсё адно не зразумеюць, дык навошта старацца? Добра, што амерыканцы мае былі надзіва цярплівыя. Кожны ў выніку дачакаўся ад мяне і ласкавага слова, і бесперапыннай балбатні (усё па тых жа ўласных граматычных правілах), і абяцання сумаваць без іх.

**УРАЖАННЕ. ЗА ШТО АБАРЫГЕНЫ З'ЕЛІ КУКА?**

Не, зразумела, мяне ніхто не з'еў. Нават думкі такой ніхто не меў. А ўсё адно страшна, як быццам не ў цывілізаваную краіну едзеш, а да кукаўскіх абарыгенаў. І страх нейкі несвядомы, не паддаецца лагічнаму тлумачэнню, страх чагосьці нязведанага, новага. Бо ніколі не ведаеш, што гэта новае табе прынясе. Прыкладна такія ж пачуцці, я мяркую, зведалі ўсе падобныя да мяне маладыя людзі, што ляцелі ў пошуках прыгожага жыцця і лёгкіх грошай у благаславёную краіну Амерыку.

Хмурны мужчына на мытні прымусіў усе мае страхі скакаць, як чэрці ў пекле. Яны што, усе такія? Непрыступныя, халодныя, незадаволеныя? Хутчэй з аэрапорта! А на выхадзе нас ужо чакаў, як быццам ведаў пра наша прыбыццё, аўтобус да аўтавакзала з вясёлым і жыццярадасным кандуктарам. А гэты ж зусім іншы. І хто з іх адлюстраванне нацыі? Не разбярэшся... Добра, пабачым, што далей будзе. А наперадзе нас чакалі сустрэчы са спакойнымі, нават бясстраснымі прадстаўнікамі сферы абслугоўвання. Ні ўсмешкі, ні хмурнага позірку, нічога, што выдавала б у іх людзей. І мы дабіраліся да месца як пад каўпаком, які засцерагаў нас ад сутыкнення з рэальнасцю.

З гэтай самай рэальнасцю я сустрэлася толькі тады, калі, дарма абыходзячы дзясяткі гатэляў у пошуках працы, вымушана была гутарыць з іх менеджарамі. І потым, калі я знайшла сабе месца, вакол мяне працавалі ў асноўным амерыканцы. Таму ў мяне была магчымасць прыглядзецца да іх і перастаць баяцца.

Згодна з наяўным міфам, амерыканцаў не цікавіць нічога, акрамя грошай. Не зусім гэта так. Іх цікавіць шчасце і здароўе блізкіх і сваё ўласнае, будучыня дзяцей і ўнукаў. Проста яны не ведаюць іншага спосабу забяспечыць гэта, акрамя як збіраць залаты запас. Праўда. Яны ў 90 % выпадкаў упэўнены, што грошы вырашаюць усё ў гэтым свеце. І толькі тыя, хто пераканаўся ў адваротным, ведаюць горкую праўду. Практычна ўся іх маёмасць куплена ў крэдыт і застрахавана, каб, барані Божа, што-небудзь з назапашанага непасільнай працай не прапала. І ў той жа час амерыканец з радасцю пазычыць вам невялікую суму, заплаціць за абед у кавярні, падзеліцца ўласным ланчам — варыянтаў шмат. І ён не будзе чакаць, што вы ў адказ таксама падзеліцеся ланчам, бо гэта насамрэч такая дробязь.

Яшчэ адзін міф: яны ўсе таўшчэзныя. Гэта таксама частка праўды. Натуральна, ёсць і вельмі хударлявыя, але залішняя маса цела ўсё ж дамінуе. І гэта не іхняя віна. Як ні зацёрта гэта гучыць, але ва ўсім вінаватыя бессаромныя вытворцы, якія імкнуцца павысіць даход за любой цаной. Праверана на ўласным вопыце: здавалася б, звычайнае печыва — а ты не можаш спыніцца, пакуль не з'ясі практычна ўвесь пачак. І так ва ўсім. І пачак тут не маленькі, як і порцыі ў кавярнях — усё адно як дзве, а то і тры нашыя. Але гэтага здалося мала прамыслоўцам. Яны зрабілі журботны выгляд і абвясцілі, што вельмі занепакоены станам здароўя нацыі, а таму вырашылі прыцягнуць найлепшых дыетолагаў і эндакрынолагаў для распрацоўкі агульнай праграмы харчавання. Улагоджаныя загадзя гіпакраты заявілі, маўляў, ешце абястлушчаныя прадукты — будзе вам здароўе і тонкая талія. Узрадаваны народ кінуўся купляць тавары «fat free» — літаральна «пазбаўленыя тлушчу». І не мае значэння тое, што, каб не страціў свае смакавыя якасці, гэты тлушч замяняецца чарговым рэчывам пад знакам Е. Наіўныя амерыканцы нават не знаходзяць часу прачытаць склад на ўпакоўцы. Навошта? Калі вялікімі літарамі напісана «МЯСА», значыць, мяса...

Міф трэці, галоўны: якія ж яны дурныя! А вось гэта не зусім праўда. Не дурныя, а неадукаваныя ў большасці выпадкаў. Пра Беларусь яны пытаюцца, якая гэта частка Расіі. Пра Расію — а Буш (пазней Абама) там таксама прэзідэнт? Яны маюць вельмі цьмянае ўяўленне пра гісторыю і насамрэч лічаць сябе пераможцамі ўсіх войнаў, нават тых, што адбыліся да адкрыцця Калумбам Амерыкі. І, зразумела, ім не хапае простай жыццёвай кемлівасці: амерыканец наўрад ці знаёмы з тым жа вантузам, і даведаўшыся, што яго можна зрабіць са звычайнай пластыкавай бутэлькі, будзе ўражаны да глыбіні душы. Але ў той жа час яны выдатна лічаць і добра ведаюць свае правы, а вось нам трэба гэтаму ў іх яшчэ вучыцца.

А ўвогуле гэта вясёлыя, жыццярадасныя і прыветлівыя людзі, якія ўсміхаюцца табе не таму, што трэба, а таму, што ты ім сапраўды падабаешся.

**Настасся БАРБОСАВА, студэнтка факультэта беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя М. Танка.**

# Электронная рэгістрацыя:

## максімум магчымасцяў пры мінімуме намаганняў

**У 2009 годзе на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі і Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы апрабавалася сістэма электроннай рэгістрацыі ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. А ў гэты годзе аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму «Агульнарэспубліканскі банк удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання» плануецца ўвесці ва ўсіх пунктах рэгістрацыі Мінска, а таксама ў пунктах рэгістрацыі, размешчаных на базе ВНУ — каардынатараў правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў абласцях.**

Па словах дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалая Фяськова, электронная рэгістрацыя дае шмат пераваг і пунктам рэгістрацыі ўдзельнікаў ЦТ, паколькі аблягчае дзейнасць арганізацыйных камісій і самім абітурыентам. У апошніх, у прыватнасці, з'яўляецца магчымасць атрымаць інфармацыю аб колькасці пасадачных месцаў у любым пункце правядзення цэнтралізаванага тэсціравання.

Напрыклад, абітурыенту, які наведаў пункт рэгістрацыі на базе БДУ, адшукаюць пасадачнае месца на ЦТ па матэматыцы ў любым з іншых пунктаў правядзення ЦТ у межах сталіцы па гэтым прадмеце нават у тым выпадку, калі ў Белдзяржуніверсітэце пасадачныя месцы закончыліся. Мяркуецца, што пры больш шырокім укараненні аўтаматызаванай сістэмы ў абітурыентаў з'явіцца магчымасць зарэгістравацца на любы прадмет у любым з пунктаў правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па прынцыпе «аднаго акна». Скажам, у Гомелі можна будзе зарэгістравацца для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў Мінску ці, наадварот, наведаць адзін з пунктаў рэгістрацыі ў Мінску і зарэгістравацца для праходжання ЦТ у Брэсце ці Магілёве. А інфармацыя аб наяўнасці свабодных месцаў будзе даступная ў рэжыме рэальнага часу.

Да таго ж пры электроннай рэгістрацыі скарачаецца час на афармленне дакументаў, паколькі знікае неабходнасць запаўняць заяву-анкету ўручную, а таму зводзіцца да мінімуму рызыка памылак пры ўнясенні ў камп'ютарную сістэму дадзеных з дакумента, які сведчыць асобу абітурыента. Аўтаматызаваныя практычна ўсе этапы работы з дакументамі, ёсць магчымасць атрымання справаздач і статыстычнай інфармацыі. І, што самае галоўнае, інфармацыйная сістэма **не дапускае рэгістрацыю абітурыентаў на большую колькасць прадметаў, чым гэта прадугледжана Правіламі прыёму, а таксама адначасовую рэгістрацыю абітурыентаў на ЦТ па беларускай і рускай мове**. Рэгістрацыя абітурыентаў On-line дазволіць пазбегнуць падобных парушэнняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «ЗАВІРУХА» — МІЖНАРОДНАЕ СВЯТА БАЙКЕРАЎ У ДОКШЫЦАХ

У Докшыцах адбыўся першы міжнародны фестываль байкераў «Завіруха-2010». У гэтым незвычайным зімовым фестывалі ўзялі ўдзел больш як 200 байкераў з Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі, іншых краін Еўропы.

Як расказаў нам прадстаўнік беларускага клуба байкераў «Desperados» у Докшыцкім раёне Аляксандр Хілько, «Завіруха» ўсім вельмі спадабалася. Многія мясцовыя жыхары падыходзілі да арганізатараў акцыі і прасілі зрабіць яе традыцыйнай.

Відовішча насамрэч было незабыўнае: парад удзельнікаў злёту, крос на матацыклах, квадрацыклах у прыгарадзе Докшыцаў, розныя байкерскія конкурсы — усё ж не пакінула нікога раўнадушным. А з якой добрай зайздрасцю разглядалі магутныя і прыгожыя матацыклы і квадрацыклы падлеткі...

Мясцовыя ўлады і асабіста старшыня Докшыцкага райвыканкама Алег Пінчук па магчымасці дапамаглі ў правядзенні «Завірухі». Фестываль байкераў у беларускай глыбінцы абяцае быць традыцыйным. Ён, бясспрэчна, стане і стымулам да развіцця байкерскага руху ў рэгіёне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Фота Сяргея ВАСЬКО.

Рэзананс

# СКАЖЫЦЕ ДЗІЦЯЦІ «ТАК»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Удзячны за неабыякавасць з боку газеты да ўзнімаемых пытанняў.**
**Ведаеце, артыкул «Так» або «Не» (26 студзеня) Вольгі Мядзведзевай з інтэрв'ю галоўнага акушэра-гінеколага Міністэрства аховы здароўя пакінуў на душы нейкі асадак. На маю думку, змешчанае ў артыкуле інтэрв'ю можа падштурхнуць людзей, што яшчэ не вагаюцца, да такіх учынкаў, аб якіх яны будуць шкадаваць усё сваё астатняе жыццё. Таму знайшоў цікавае апавяданне і напісаў гэты ліст.**

## ХРЭСНІКІ

— Хрэснічак твой нявесту прывёз, ты ўжо прыходзь, Маўрунь, будзьма спяваць, як належыць, — чарговы раз пачуў я гэтае слова, дзіўнае для няхрышчанай і няверуючай бабулі, і раптам зноўку прыгадаў тонкі пруток, пеўніка, адлітага на яго дзяржанні, палаючыя свечкі, убачаныя скрозь шчыліну пячной фіранкі, дзіўныя вершы нараспеў...

...Доўга яшчэ ў пасляваенныя гады ў краіне былі забароненыя аборты па жаданні жанчыны, — патрабаваліся асаблівыя паказанні, ды і з імі было не ўсё так проста.

І нават калі, нарэшце, аборты былі дазволеныя, — зрабіць іх у вёсцы было практычна немагчыма. Трэба было ехаць у «раён» — г.зн. у раённы цэнтр, дзе быў адпаведнай кваліфікацыі персанал і тэхнічная магчымасць для такіх працэдур.

Але ж дазволіць — дазволілі, але ганьбай і чымсьці брудным гэтая працэдура ўсё адно засталася і ніякай урачэбнай таямніцы за сабой не несла. Нават калі на «выскрабанне» прыходзіла дзеўка дарослая, здольная сама прымаць рашэнні — усё адно ў яе вёску навіна далятала праз некалькі дзён, асуджаючы на скосыя позіркі і пляўкі наўздагон. «Скінуць» было больш ганебна, чым «загрубець» без мужа. Таму шмат хто вырашаўся на пошукі бабуль-майстрых на такую справу...

— Ці цвёрда вырашыла, харошая мая? — пыталася бабуля ў дрыжачай дзеўкі.

— Т-так...

— Ну тады сядзі, слухай, глядзі, сёння буду рыхтаваць цябе, а заўтра ўжо і справу зробім.

Яна ставіла на стол вялікую драўляную шкатулку, фарбаваную чорным патрэсканым лакам, вымала з яе чырвоную аксамітную сурвэтку, складзеную ў чатыры стосікі, рассцілала яе, затым клала зверху пруток дзіўнага выгляду, з кручкаватым загнутым вастрыём і дзяржаннем у форме пеўніка, што ад вялікага спуду падняў крылы...

Увесь гэты час яна нягучна прыгаворвала ці то вершы, ці то малітвы з дзіўнаватымі рыфмамі, з якіх чулася:

*— ...Будзем-будзем мы шукаць,*
*Як нам дзетачку прыбраць,*
*Спі, малеча, спі, малыш,*
*Больш у мамцы не паспіш...*

Потым, дрыжучы, наведвальніца клалася на лаву, пастаўленую пасярод пакоя, па баках ад яе бабуля ставіла на падлогу паабразаныя шкляныя колбы. На іх донцы капала расплаўленым воскам і прымацоўвала дзве свечкі, якія прыносіла сама дзяўчына.

Працягваючы нараспеў прыгаворваць, бабуля раптам заціхала, смела праводзіла далонню праз полымя абедзвюх свечак і казала:

— Хлопчык... гэта добра, хлопчыкі лёканькія, выпрыгваюць самі, а гэты яшчэ і з чубчыкам, жвавы, паскакун...

На аголены жывот клаўся пруток, звісаючы за край сваім пеўнікавым дзяржаннем. Пруток гэты дзвюма суханькімі далонькамі бабуля некалькі разоў пракатвала ад грудзей да самага ніза жывата і назад. Яна працягвала гутарыць з кімсьці нябачным, прыгаворваючы словы, сэнс якіх я ніяк тады не мог уцяміць:

*— Катаю вераценца,*
*Гляджу, як праз акенца,*
*Птушанятка магло жыць,*
*Настаў час яго згубіць...*

Раптам яна пхала дзяржанне гэтага жахлівага прутка дзяўчыне і патрабавала:

— Бяры ў руку моцна, сама пракаці вераценца, што пачуеш — крычы.

Дзяўчына бралася за пеўніка і з ляманам адхоплівала руку:

— Горача!

— Усё правільна, усё правільна, — шаптала ёй бабуля, — значыць, гэтая працэдура для цябе апошняя, значыць, больш не зацяжарыш, як вычысцім цябе заўтра, — пеўнік знак падаў...

Потым была гарбата са святаяннікам, мятай і мацярдушкай, якую госця піла, апякаючыся і баючыся адмовіць. Потым бабуля расчэсвала ёй валасы, паўтараючы ўжо зусім іншыя вершы:

*— Валасы і галоўка,*
*Маўчы, мая салоўка,*
*Не пачуе дзяўчына*
*Пра сонейка-сына...*

Выпраўляючы дзяўчыну дамоў, бабуля дамаўлялася з ёй назаўтра, уначы а дванаццатай гадзіне, са сваёй прасцінай і ватай-бінтамі.

Назаўтра ніхто не прыходзіў.

Як яны знаходзілі бабулю, як ім раілі менавіта яе — загадка... Ведаю толькі, што ў трох буйных вёсках у яе былі «таварышкі» — знаёмыя бабулькі, якія даводзіліся ёй далёкімі сваячкамі, кумамі альбо зусім сёмай вадой на кісялі, пра якіх ішла вядомая пагалоска, — вось да іх і звярталіся загрубелыя маладухі, а тыя ўжо і накіроўвалі іх да бабулі.

Праходзілі месяцы, іншы раз — гады...

У сенцах я раптам бачыў жанчын, што плакалі і цалавалі рукі спалоханай бабулі, суровыя бацькі падсоўвалі пухлыя канверты, але грошай бабуля не брала.

Тады і з'яўляліся раніцой каля прыступак ганка жбанкі з сырадоем, у берасцянцы добры такі шматок сала, у самаробным ліпавым кошыку вялікі кавалак масла, схаванага ў пергамент. Аднойчы на маіх вачах з вайсковага УАЗіка выгрузілі поўную скрыню венгерскіх яблыкаў — небывалы ласунак пасярод сібірскай зімы.

А ўжо калі бабулі трэба было наняць машыну, каб дровы перавезці, — тады, нягледзячы на ўсе ўгаворванні ўзяць грошы, машыну прыганяў чарговы «хрэснік» і браў толькі тое, што належыць «па завядзёнцы», — на бутэльку чырвоненькага.

У выніку малако яна адносіла суседу, хвораму на сухоты п'янчугу, якога часам ушчувала за залатыя рукі, што забылі іншы інструмент, акрамя паўлітровіка, яблыкі даставаліся і родным унукам, і суседскай цыганскай сям'і.

— Няўжо НІВОДНАЯ так і не прыйшла на другі дзень? — аднойчы, незадоўга да яе інсульта, адважыўся я запытаць.

— Прыходзілі... дзве... — у яе правым воку, якое ўжо не бачыла, з'явілася маленькая слязінка.

Так, я ўспомніў — *«Сыр тут кхар-на, про лав?»* — размову бабулі з зусім маладой, фігурыстай на выгляд, але відавочна гадоў 14 цыганачкай, якая прыйшла і на другі дзень. Што прымусіла яе, якую з радасцю прыняў бы любы табар, на гэты крок — не ведаю... Як не ведаю і прычын, якія былі ў другой, статнай і гэткай жа чарнабровай дзяўчыны з рэзкім уладным голасам, з якой бабуля гутарыла на якойсьці мове, падобнай на нямецкую, рэзкай і адрывістай. Заканчэння сустрэч з тымі няўмольнымі наведвальніцамі я не дачакаўся і пра іх далейшы лёс нічога не ведаў.

— І ты іх?.. — закончыць сказ мне было не пад сілу.

— Ды ну-у, што ты, — пеўнік не даў прапасці, дапамог, — ужо праз слёзы усміхнулася бабуля... — Памятаеш рыбку фаршыраваную?

І сапраўды — аднойчы ля ганка мы знайшлі вялікую прыгожую талерку, у якой ляжаў загорнуты ў фольгу вялізны шчупак, унутры якога было нешта напханае. Смаку невыказнага: гэткай стравы не рабілі ні мама, ні сама бабуля. А цыганачка... — пра яе таксама зразумеў, калі я ўспомніў пра любімыя бабуліны пацеркі, кожны шарык якіх быў сашчэплены з чатырох частак і быў зроблены з нейкай дзіўнай, амаль няважкай драўніны...

...Я стаяў на сцяжынцы паміж чужых магілак і ўсё не адважваўся падысці, супакоіць бацьку, які сядзеў каля магілы і плакаў. Маю ўвагу прыцягнула купка незнаёмых людзей, пераважна жанчын, што цярпліва чакалі ўбаку, пакуль пойдуць апошнія сваякі. Сярод гэтых людзей былі і дзеці рознага ўзросту, і маладыя хлопцы.

Нарэшце бацька падняўся, паправіў вянкі, кінуў апошні позірк на свежую зямлю і павольна пайшоў да выхаду, не хаваючы слёзаў. Незнаёмцы крыху пачакалі, а потым сталі па чарзе падыходзіць да магілкі, нешта шаптаць і раскладваць зверху ўсіх вянкоў жывыя кветкі. Нікога з іх я не бачыў на памінках. Паклаўшы кветкі, дарослыя сталі вакол, а ў гэты час маленькая дзяўчынка паклала на стужку верхняга вянка нейкую, як мне здалося, цацку, падобную на карамельнага пеўніка.

...Прайшоў амаль год. Нікога не папярэдзіўшы, я прыехаў на Дзяды на могілкі і яшчэ са сцежкі ўбачыў тое, што потым стала лесам з карамельных пеўнікаў на бабулінай магіле. Ужо цямнела, але людзі з пеўнікамі ўсё падыходзілі і падыходзілі...

**(http://community.livejournal.com/za_plintusom_ru/6609.html)**

Будучыя мамы і таты, калі вы яшчэ ў сумненнях, знайдзіце магчымасць пачытаць апавяданні і артыкулы пра аборты на рускім сайце www.noabort.net.

Хацеў бы распачаць свой ліст словамі з прамовы Маці Тэрэзы (1994):

***«Самы вялікі разбуральнік свету сёння — гэта аборт, таму што гэта вайна супраць дзіцяці, прамое забойства нявіннага дзіцяці, забойства самой матуляй.***

***І калі мы згаджаемся з тым, што маці можа забіць нават сваё роднае дзіця, як мы можам патрабаваць ад іншых людзей не забіваць адно аднаго?***

***Адзін аборт павялічвае лік іншых абортаў. Любая краіна, якая дазваляе аборты, не вучыць сваіх людзей любові, аднак выкарыстоўвае любы прымус дзеля дасягненняў сваіх мэтаў. Вось чаму аборт — гэта найвялікшы разбуральнік любові і свету».***

У мове нашых продкаў за кожным словам можна было ўгледзець вобраз. Слова «аборт» замежнае, і азначае «памерці перад нараджэннем». За гэтым словам не бачна вобразу, таму грамадства так спакойна да гэтага ставіцца. Дзіця ў ім уяўляецца як нейкая рэч. Затое ў беларускай мове існуе больш ёмістая назва: «дзетазабойства». Таму прапаную называць рэчы сваімі імёнамі. Не трэба гуляць словамі, што пры аборце ці вакуум-аспірацыі выдаляецца «аплодненая яйцаклетка», «эмбрыён» ці яшчэ нешта. Як толькі зліліся мужчынская і жаночая палавыя клеткі, пачалося новае жыццё. Так званая «аплодненая яйкаклетка» — гэта ўжо не частка арганізма маці, гэта новы арганізм, які бліжэйшыя 9 месяцаў проста будзе жыць унутры маці, а значыць і поўнасцю залежыць ад яе.

Калі жанчына вырашыла забіць уласнае дзіця, то гэта сведчыць аб яе дрэнным псіхалагічным стане. Каб заглушыць мацярынскі інстынкт, трэба вялікі стрэс. І рашэнне «забіць» сведчыць аб тым, што ёй патрэбна дапамога з боку родных, з боку грамадства, псіхолага, духавенства.

Нашым людзям любяць паказваць па тэлебачанні розныя фільмы жахаў. Словы з сухімі лічбамі і малюнкі эмбрыёнаў на плакатах у жаночай кансультацыі нікога не ўражваюць. Чыноўнікі ўпэўненыя, што гэтую інфармацыю дакладна могуць несці толькі медыкі. Згодна з «Нацыянальнай праграмай дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2007—2010 гады» Міністэрства аховы здароўя з'яўляецца каардынатарам падпраграм «Ахова здароўя маці і дзіцяці» і «Фарміраванне здаровага ладу жыцця і стварэння спрыяльнага асяроддзя пражывання». Ужо 2010 год. Дык калі мы «не маем нічога супраць», чаму не паказваем грамадству, што адбываецца з дзеткамі і маці, што робіць з арганізмам алкаголь і тытунь. Гэтых ролікаў шмат у інтэрнэце і ніводнага не ўбачыш па тэлебачанні. Можна б было прапанаваць для публікацый у прэсе апавяданні жанчын, якія здзейснілі дзетазабойства, і якія цяпер імкнуцца праз інтэрнэт данесці да іншых свае адчуванні.

З гісторыі ўсе мы ведаем, што ў гады вайны ў краіне загінуў кожны чацвёрты беларус.

А ці ведаеце, што і сёння, у «мірны» час, у лякарнях забіваюць амаль кожнае чацвёртае дзіця: у 2008 годзе нарадзілася каля 108 тысяч, зроблена дзетазабойстваў больш за 42 тыс. Кожныя 13 хвілін у краіне немаўля пазбаўляюць жыцця, кожны дзень адбываецца 115 забойстваў, за якія ніхто не павінен несці адказнасць. Няўжо ж у нас павінна было нарадзіцца 42 тысячы немаўлят з парокамі, не сумяшчальнымі з жыццём? Ва ўсім Мядзельскім раёне пражывае 30 тысяч чалавек. 42 тысячы — гэта прыкладна колькасць усіх нашых урачоў у краіне ў 1990 годзе (цяпер урачоў значна больш). За 2008 год у краіне стала прыблізна на 26 тысяч чалавек меней. Але ж калі б не было гэтых забойстваў (ці хоць бы іх было меней), тады насельніцтва краіны магло б вырасці. Звесткі за 2008 год узяты з афіцыйнага сайта Міністэрства аховы здароўя Беларусі (Дакумент «Стан здароўя насельніцтва і арганізацыя медыцынскай дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь у 2008 годзе», старонка 32).

Даўно вядома, што ў краіне масава пачалі зачыняць школы, бо няма дзетак. Зараз дзетак ва ўзросце да 15 гадоў каля 1,4 мільёна. Па звестках таго ж Міністэрства аховы здароўя, з 2000 года дзетак стала менш амаль на 300 тысяч (па колькасці гэта будзе прыкладна насельніцтва Брэста), а колькасць дзяцей-інвалідаў павялічваецца. «У параўнанні з 1993 годам інваліднасць дзяцей ва ўзросце да 4 гадоў узрасла ў 3,4 раза, да года — у 9,5 раза», — канстатуе «Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі на 2007—2010 гады». Дзетак усё менш, парокаў у іх — больш. Лічу, што некаторыя медыкі (з маўклівай згоды грамадства) хутчэй імкнуцца забіць дзіця нават толькі з падазрэннем на парок (метад УГД не дазваляе на 100 % выявіць, ёсць парок ці не), каб потым не трацідца на догляд дзіцяці і не несці адказнасць у выніку смерці. І гэта замест таго, каб голасна і настойліва агучваць і змагацца з прычынай з'яўлення парокаў. Бо асноўныя прычыны інваліднасці немаўлят даўно вядомыя: курэнне і алкаголь.

Продкі дрэнна ставіліся да дзетазабойства, і дзетазабойстваў амаль не было, таму ўсё больш разумею, чаму прыхільнікі забойстваў так чапляюцца за 1953 год. Нагадаю, што дзетазабойства было дазволена на тэрыторыі былога Саюза толькі ў 1920 годзе Леніным. Сталін у 1936 годзе абвясціў дзетазабойства нелегальным. І зноў яго дазволілі ў 1953 годзе, менавіта пасля яго смерці. У шмат якіх краінах дазвол на дзетазабойства наогул быў дадзены пасля 70-х гадоў у часы так званай сэксуальнай рэвалюцыі: у час сэксуальнай уседазволенасці, калі шмат хто не хацеў бачыць і адказваць за вынікі сваіх пагулянак.

«Па звестках ААН, у 4 са 193 краін дзетазабойствы наогул забароненыя. У 119 краінах са 193 дзетазабойства дазволена толькі пры пагрозе для жыцця ці здароўя маці. Толькі ў 41 са 193 краін дзетазабойства дазволена па патрабаванні матулі», — паведамляе сайт noabort.net, звесткі ААН за 1996 год.

Забойства супярэчыць чалавечай істоце. У духоўна здаровым грамадстве пытанні наконт дзетазабойства ўзнімацца не будуць. Таму не патрэбен будзе і закон, які забараняе. Але ж для гэтага трэба, каб людзі ведалі аб дзетазабойствах не праз тэлесерыялы, ток-шоу і спрэчкі на форумах у інтэрнэце.

У краіне ідзе палеміка пра забарону ці ўвядзенне мараторыя на смяротнае пакаранне. Мы спрачаемся: трэба пакараць злачынцу смерцю ці можна яму дараваць, няхай пажыццёва знаходзіцца за кратамі. Калі мы такія велікадушныя, чаму ж мы не спрачаемся: хто даў нам права караць смерцю яшчэ ні ў чым не павіннае дзіця?

Пэўна, не будзе адкрыцця, калі скажу, што колькасць насельніцтва на планеце хутка расце, а рэсурсы абмежаваныя. У так званых развітых краінах шмат прыхільнікаў тэорыі «Залатога мільярда». Таму існуе меркаванне аб тым, што самае лепшае выйсце ў абмежаванні насельніцтва «непатрэбных» краін. І сёння колькасць насельніцтва краін рэгулюецца ў тым ліку і «правільным» стаўленнем грамадства да абортаў. Таму лічу, што гэтай бядзе дапамаглі прыйсці да нас у краіну.

Выклікае цікавасць, з чыёй лёгкай рукі ў грамадстве зрабіліся такімі папулярнымі выказванні «маленькія ДЗЕТКІ — маленькія БЕДКІ» і «не надо плодить нищету». Кожны другі паўтарае гэтае глупства.

Мала хто цяпер разважае над тым, што хутка ў краіне будзе зусім мала працоўных рук і вельмі шмат старых, якіх давядзецца карміць сённяшнім немаўлятам. Вось калі прыйдуць бедкі і галеча.

За дрэнныя ўчынкі адказнасць нясуць не толькі тыя, хто іх учыняе, але і тыя, хто сваёй абыякавасцю дапамагае ім адбыцца.

Людзі, беражыце вашых дзетак, бо гэта адзінае ваша багацце.

**З павагай Аляксандр ПЯТРОЎ, вёска Будслаў, Мядзельскі раён. Brat77@tut.by**

Шануй сваё!

# Крайні злева на здымку — ХУСЭЙН ДАНАГУЙ

## ПРАЗ 75 ГАДОЎ У ДАГЕСТАНЕ ЗНАЙШОЎСЯ СТРЫЕЧНЫ ЎНУК ГЭТАГА КАЛАРЫТНАГА СЯБРА АЛЬБРЭХТА РАДЗІВІЛА

**Яшчэ адсканаваўшы гэтае групавое фота ў альбоме шаноўнай князёўны Эльжбеты Радзівіл (у цэнтры — князь Альбрэхт, яе бацька), я зацікавіўся: з кім жа толькі ні сябравалі Радзівілы!.. І прынц Манака, і італьянская каралева, і — вось — сапраўдны горац. Аднак ні імя, ні звестак пра гэтага чалавека нідзе знайсці не ўдалося.**



У цэнтры — князь Альбрэхт Радзівіл, крайні злева — Хусэйн Данагуй. Нясвіж, пачатак 1930-х.

І вось да майго старэйшага калегі Уладзіміра Багданава звярнуўся з Дагестана спадар Хаджы Мурад, які папрасіў дапамогі. Хаджы пісаў:

«У майго прадзеда быў стрыечны брат Хусэйн Данагуй (Данагуеў) — вайсковец, пасля Першай сусветнай апынуўся ў Польшчы, ваяваў з Чырвонай Арміяй, пасля замірэння застаўся ў Польшчы, паступіў у 10-ы Уланскі полк, пасля выхаду ў адстаўку пасяліўся ў свайго сябра князя Радзівіла (імя яго я не ведаю, а іх жа было нямала!) у г. Нясвеж (*паўсюль напісана менавіта так.* — **Аўт.**) і там у 1933 годзе памёр і быў пахаваны. Я знайшоў ягоныя палкавыя здымкі, некралог у эмігранцкім часопісе і хачу паехаць туды ўлетку, каб адшукаць ягоную магілу...»

Спадар Уладзімір звярнуўся да мяне, ведаючы, што я дужа цікаўлюся Радзівіламі канца XIX—XX стагоддзя. Я адразу скумекаў, што сябраваў Хусэйн Данагуй, хутчэй за ўсё, з князем Альбрэхтам Радзівілам. Альбрэхт памёр у 1935 годзе — падыходзіць па часе. Да таго ж, князь Альбрэхт сам служыў у палку ўланаў і да апошняга, хоць сам стаў інвалідам — ездзіў у вазочку, падтрымліваў з імі кантакты.

Так і сталася — сярод 535 здымкаў Радзівілаў, якія мне ўдалося сабраць на сёння, адшукаўся падыходны. На ім князь Альбрэхт, ужо з хворымі нагамі, сядзіць у двары Нясвіжскага замка, а наўкол стаяць уланы. І крайні левы — вельмі верагодна, Хусэйн Данагуй!..

Якая ж была мая радасць, калі атрымаў адказ з Дагестана! Хаджы Мурад пісаў:

«На групавым здымку — крайні злева і ёсць Хусэйн Данагуй, мой стрыечны прадзед, а тое, што ён (як мне падалося) яшчэ і поўны Георгіеўскі кавалер, дык гэта дзіўна ўтрая! Такога фота ў мяне не было, ёсць іншыя здымкі таксама з ягонымі сябрамі-вайскоўцамі, аднак крыжоў там не бачна. З усяго, што я знайшоў пра яго, ведаю, што яму было дазволена насіць сваё каўказскае адзенне ў часе службы ў 10-м уланскім палку. Высылаю вам артыкул пра яго і некралог з часопіса «Горцы Каўказа», які выдаваўся ў Пырыжы. Мяркую, у Нясвіжы будзе шмат цікавага па Хусэйну — ён там для свайго часу, напэўна, быў каларытнай фігурай! Пацяплее — і буду збірацца ў Нясвіж! З павагай, Хаджы Мурад».

У дасланым часопісе «Горцы Каўказа» адзін з чытачоў, схаваўшыся за ініцыяламі «Б.К.» піша пра Хусэйна Данагуя, які «на той час меў больш за 85 гадоў». У прыватнасці, мілая дэталь: «Жыхары горада Нясвежа, дзе стаяў полк, часта мелі магчымасць бачыць старыка-каўказца, які сядзеў на шэрым арабе ў поўным нацыянальным касцюме і з шашкай. Свайго араба Хусэйн шкадаваў і пасля выхаду з палку, казаў, што спадзяецца яшчэ пабачыць Каўказ і яго стары баявы таварыш саслужыць яшчэ яму там службу».

Аднак лёс вызначыў інакш — Хусэйн захварэў на рак страўніка. Чытач часопіса ўсхвалявана піша: «Цяпер ён ляжыць у Нясвіжы ў маёнтку князя Радзівіла — ардыната Нясвежскага. Князь Радзівіл атачыў яго бацькоўскім клопатам, забяспечыў яго не толькі матэрыяльна, але і падтрымлівае хворага старога маральна. Мы, горцы, не павінны забыцца на добрую справу, якую робіць князь Радзівіл для нашага суайчынніка».

У наступным нумары часопіса, на жаль, з'явіўся ўжо некралог...

«**Хусэйн Данагуй памёр.** Хусэйн Данагуй, стары горац, — здымак якога мы змясцілі ў папярэднім нумары — памёр. Цяжкая хвароба не дала яму магчымасці пабачыць родныя горы, да якіх ён так горача імкнуўся. Пахаваны ён у горадзе Нясвежы намаганнямі мясцовай мусульманскай грамады і пры матэрыяльнай дапамозе князя Радзівіла, мясцовага ардыната. Мір праху нябожчыка, а ўсім, хто аддаў яму апошні доўг, наш горскі дзякуй».

Хаджы Мурад, які даслаў гэтую інфармацыю, у мінулым годзе разам са сваім сынам ужо наведаў польскае мястэчка Ракітна, дзе загінуў і быў пахаваны ягоны дзед, цяпер вось збіраецца ў Нясвіж... І апроч таго, што мы даведаліся яшчэ пра аднаго чалавека са старых здымкаў, пра незвычайнага жыхара Нясвіжа таго часу, мне падумалася: каб кожны з нас так імкнуўся ведаць і шанаваць сваіх продкаў, захоўваць памяць пра іх, перадаваць наступным пакаленням. Толькі памятаючы свой род, мы захаваемся як нацыя.

Да якога калена ведаеце свой радавод вы?



Хусэйн Данагуй на сваім верным арабе. Фота з часопіса «Горцы Каўказа», 1933 год.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота з архіва Эльжбеты РАДЗІВІЛ і Хаджы МУРАДА.**

Адпачынак-2010

# У ЛЕТНІКІ — БЕЗ ЧЭРГАЎ

**22,4 тыс. працуючых грамадзян, 20,2 тыс. непрацуючых ветэранаў працы, інвалідаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, Узброеных сілаў і органаў унутраных спраў, 17 тыс. студэнтаў, 2,5 тыс. дзяцей-інвалідаў, 103,5 тыс. дзяцей з забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі, а таксама 707,4 тыс. дзяцей, якія патрапяць у аздараўленчыя лагеры. Паводле звестак Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, усяго за кошт бюджэту і сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ў 2010 годзе пуцёўкі атрымаюць 905,1 тыс. жыхароў Беларусі. Пры гэтым чакаецца, што сёлета стане менш вострай праблема з аздараўленнем непрацуючых пенсіянераў і інвалідаў у сталіцы. Праўда, аднапасова ўжо сёння можна прагназаваць і паўтарэнне сітуацыі з ажыятажным попытам на «дарослыя» санаторыі ўлетку.**

### ЗВАЖАЙ НА БРОНЮ

Паляпшэнне якасці пражывання, харчавання і, зразумела, медыцынскіх паслуг. Сёння айчынныя здраўніцы прапануюць па сутнасці ўсе неабходныя профілі лячэння: органаў дыхання, страваваня, хваробаў сістэмы кровазвароту, касцёва-мышачнай сістэмы, мочапалавой сістэмы, скуры і падскурнай клятчаткі, нервовай і эндакрыннай сістэм. І гэта адыгрывае сваю ролю: беларускія санаторыі карыстаюцца ўсё большай папулярнасцю сярод грамадзян іншых краін. Калі ў 2008 годзе на аздараўленне да нас прыехалі 106,3 тыс., то, нягледзячы на вядомыя ва ўсім свеце эканамічныя праблемы, летась — ужо 129,9 тыс. замежнікаў. І сам па сабе гэты факт падаецца адметным не толькі з пункту гледжання прэстыжу краіны. Замежнікі «прывезлі» грошы, а гэта ў сваю чаргу дазволіла забяспечыць укладанні ў развіццё медыцынскага абслугоўвання, інфраструктуры адпачынку, паляпшэнне ўмоў пражывання. Прычым патрабаванні да ўсяго гэтага змяняюцца. Так, даводзіцца канстатаваць: нумары на 3-4 месяцы становяцца ўсё менш запатрабаванымі, тады як колькасць заявак на 1-2-месяцныя нумары, наадварот, узрастае.

Разам з тым, таксама не сакрэт: папулярнасць аздараўлення ў айчынным фармаце павялічваецца і ў грамадзян нашай краіны. Летась у сярэднім беларускія санаторыі былі запоўненыя на 88 працэнтаў. А ўлетку пуцёўкі аказаліся сапраўдным дэфіцытам.

— У нас ёсць 103 санаторыі на 24,5 тысячы і 271 аздараўленчая арганізацыя на 50 тыс. месцаў, — адзначае **начальнік аддзела перспектыўнага развіцця санаторна-курортных арганізацый, рынкавых адносінаў, аналізу і кантролю Рэспубліканскага цэнтра Міхаіл ЯРОХІН.** — Так, пытанне пашырэння «ўмяшчальнасці» вывучаецца, але трэба заўважыць: у цяперашняй сітуацыі гэта не проста, галоўнае цяпер — захаваць свае пазіцыі. І, па магчымасці, — праводзіць рэканструкцыю здраўніц.

Што ж да дэфіцыту «дарослых» пуцёвак, то ў Рэспубліканскім цэнтры заўважаюць: як правіла, ён адзначаецца толькі ў ліпені-жніўні. Вялікіх праблем у іншы час года няма. Прычым не сакрэт: у «міжсезонне» санаторыі забяспечваюць тымі ж умовамі пражывання, аказваюць тыя ж медыцынскія паслугі і часта, дзякуючы сістэме зніжак, — за меншыя грошы.

— Я сапраўды параіў бы звярнуць увагу на восень, зіму і вясну, — кажа Міхаіл Ярохін. — Аднак калі ёсць жаданне атрымаць пуцёўку менавіта летам, то лепшы варыянт — паклапаціцца аб яе набыцці ўжо сёння. Планаваць час адпачынку трэба загадзя, тым больш, што большасць санаторыяў дае магчымасць папярэдняга браніравання месцаў. Пры гэтым у выпадку ўзнікнення «форс-мажорнай» сітуацыі ёсць варыянты поўнага або частковага вяртання грошай — падобныя пытанні вырашаюцца здраўніцамі ў індывідуальным парадку.

### ЦАНА З АГЛЯДКАЙ НА «ЛІМІТ»

Летась сярэдні кошт пуцёўкі ў беларускія здраўніцы склаў каля 800 тыс. рублёў. Сёлета, мяркуюць у Рэспубліканскім цэнтры, гэта лічба істотна не зменіцца — пакупная здольнасць беларусаў мае пэўны «ліміт». Тым больш, што «цэтлік» на наведванне санаторыяў вельмі розны — часта ён выходзіць за мільён.

Пры гэтым сёлета захаваецца сістэма дзяржаўных датацый. Грамадзяне, якія набываюць пуцёўкі праз Рэспубліканскі цэнтр, будуць мець магчымасць аплаціць з уласнай кішэні толькі яе частку. Памер частковай аплаты залежыць ад памеру даходаў і часу наведвання здраўніц. Скажам, асобы з даходам менш за 0,5 сярэдняй па краіне зарплаты павінны знайсці грошы толькі на 15 працэнтаў ад рэальнага кошту пуцёўкі ў «зімовы» (з 1 лістапада па 30 красавіка) і 20 працэнтаў — у «летні» (з 1 мая па 31 кастрычніка) перыяд. Памер аплаты для грамадзян з даходамі ад 0,5 да 1 сярэдняй зарплаты вызначаны адпаведна ў 20 і 30 працэнтаў, з даходамі ад 1 да 1,5 сярэдняй зарплаты — у 30 і 40 працэнтаў, ад 1,5 да 2 сярэдніх зарплат — у 40 і 55 працэнтаў, ад 2 да 3 сярэдніх зарплат — у 50 і 70 працэнтаў, ад 3 да 4 сярэдніх зарплат — у 60 і 80 працэнтаў, ад 4 да 5 сярэдніх зарплат — у 85 і 90 працэнтаў. Такім чынам, 100-працэнтная аплата прадугледжваецца толькі для грамадзян з даходам у 5 і больш сярэдніх па краіне зарплат.

### У МІНСКУ ШАНЦЫ ЎЗРАСТУЦЬ

